УДК 947.2

А. А. Дамарад, аспірант

# АСАБЛІВАСЦІ ІНТЭГРАЦЫІ НЕТЫТУЛАВАНАЙ ШЛЯХТЫ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАД ДВАРАНСТВА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (КАНЕЦ XVIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIX СТ.)

The article reveals special features of the integration processes inside higher groups of the Russian empire society. On the basis of archival sources and scientific researchs the two-stage process of indigenat and naturalisation, law violations and abuse one's position at the local nobility elections, falsification of the documents proving noble rank, unwillingness of the untitled shlahta to serve in the government bodies, election rights state limitations for poor nobility of western gybernies and also contemporary striking illustration of untitled shlahta successful integration into the Russian empire nobility in the late XVIII–middle XIX centuries are showing and analyzing. The deduction, confirming quite consecutive results of this process, is made. Уводзіны. Інтэграцыйныя працэсы звычайна знаходзяцца ў залежнасці ад многіх фактараў. Шматлікія абставіны часта перашкаджаюць паспяховаму праходжанню гэтых працэсаў. Тытулаваныя шляхецкія роды з беларускіх зямель у апошняй чвэрці XVIII–XIX стст. у цэлым паспяхова інтэграваліся ў склад дваранства Расійскай імперыі. Некалькі іншая сітуацыя склалася з нетытулаванымі прадстаўнікамі мясцовай шляхты.

Асобныя аспекты сістэмы дваранскага самакіравання ў заходніх губернях Расійскай імперыі закранаў С. А. Корф [1]. Колькасны склад шляхты былой Рэчы Паспалітай і прычыны яе вялікай удзельнай вагі сярод насельніцтва вывучаліся археаграфамі XIX ст. І. Я. Спрогісам [2] і П. Гільтэбрандтам [3]. Сучасныя даследчыкі таксама звярталі ўвагу на праблемы ўладкавання шляхты ў Расійскай імперыі. Так, Я. Анішчанка у сваіх навуковых публікацыях аналізуе зацікаўленасць шляхты ва ўдзеле ў дваранскіх выбарах [4]. Агульнай палітыкай урада ў адносінах да шляхты займалася С. Л. Лугаўцова [5]. Неабходна заўважыць, што гэтая палітыка разглядалася як антышляхецкая па сваёй сутнасці.

Мэта даследавання – выявіць і прааналізаваць асаблівасці інтэграцыі шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі.

Вынікі зробленага намі вывучэння адпаведных дакументаў з архіва канцылярыі Віленскага і Гродненскага губернскіх дваранскіх дэпутацкіх сходаў дазваляюць казаць аб тыповай сітуацыі з пацверджаннем шляхецтва, якая склалася ў беларускіх землях. Асноўная маса шляхецкіх родаў атрымала пацверджанні Віленскага дваранскага дэпутацкага сходу недзе на мяжы XVIII–XIX ст., аднак прызнанне дваранскага паходжання на губернiскім узроўні было яшчэ недастатковым. Яно патрабавала зацвярджэння ў Герольдыі–цэнтральным органе дзяржаўнай улады па пытаннях пацверджання шляхецтва, які знаходзіўся ў Санкт-Пецярбургу. З гэтай прычыны канчатковае прызнанне ў шляхецкіх правах звычайна зацягвалася на дзесяцігоддзі. У выніку асноўная маса дваран, якія пражывалі ў Віленскай губерні, дабіліся пацверджання свайго статусу толькі ў 30–40 гг. XIX ст. Такому доўгаму тэрміну вырашэння адзначанай праблемы спрыялі таксама і аб’ектыўныя прычыны: вайна 1812 г. і паўстанне 1830–1831 гг.

У Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях працэс пацверджання шляхецкага паходжання таксама быў звычайна вельмі марудным. У адрозненне ад губерняў Віленскай і Гродзенскай, хуткасць яго ў асобных выпадках была вельмі рознай. Паспяхова адбывалася пацверджанне шляхецкіх правоў роду Васілеўскіх. Непасрэдна справа была распачата ў 1833 г., а ўжо 31 снежня 1834 г. выйшаў указ Сената аб зацверджанні ў расійскім дваранстве гэтай шляхецкай фаміліі [6, л. 218]. Да таго ж часу ў уладаў увогуле не ўзнікала пытанне аб шляхецтве роду Васілеўскіх, паколькі яшчэ па спісах 1795 г. жыхары Нясвіжскага павета Восіп Васілеўскі, яго сын Гаўрыіл і пляменнік Пётр «Несвижского повета владения помещика князя Радзивилла в деревне Качановичах в седьмом доме... в числе чиншевой шляхты записанными состоят» [6, с. 24]. Таксама як і Васілеўскія, у першую частку радаводнай кнігі Мінскай губерні былі запісаны Кунцэвічы, што жылі ў маёнтку Цімкавічы Слуцкага павета. У 1816 г. губернскі дваранскі дэпутацкі сход прызнаў за імі шляхецкую годнасць, аднак да 1843 г. не выйшаў указ Герольдыі, які б пацвердзіў гэтае рашэнне на агульнадзяржаўным узроўні. Па гэтай прычыне Антоній Сцяпанавіч Кунцэвіч звярнуўся з прашэннем аб вырашэнні гэтага пытання да імператарскай асобы, дзе ўказаў, што ўсе неабходныя доказы дваранскага паходжання свайго роду былі прадастаўлены ў неабходны тэрмін, але мясцовыя ўлады патрабуюць ад яго пацверджання саслоўнага статуса. Неабходна адзначыць, што дадзены дакумент ніяк не паўплываў на паскарэнне працэсу прызнання роду Кунцэвічаў у дваранстве, а імянны ўказ быў выдадзены толькі 14 чэрвеня 1860 г. [7, с. 20, 70]. На падставе прыведзеных прыкладаў можна меркаваць, што гэткай валакітай з прызнаннем шляхецкіх правоў інтэграцыйныя працэсы паміж

шляхтай беларускіх губерняў і ўласнарускім дваранствам істотна стрымліваліся. Асабліва праявілася гэта пры паступленні мясцовай шляхты на дзяржаўную службу. Больш-менш прывабную вакансію, не маючы расійскага дваранства, заняць было немагчыма. Таму толькі некаторыя асобы з ліку мясцовай шляхты сталі расійскімі чыноўнікамі. Так, у Вілейскім павеце, як сведчаць архіўныя крыніцы, на 1851 г. усяго два шляхецкія роды, што мелі «статскія» расійскія чыны, канчаткова пацвердзілі свае паходжанне ў Герольдыі. Указам ад 30 красавіка 1837 г. дваранскія правы былі зацверджаны за Багарэвічамі, з якіх Казімір меў ранг калежскага асэсара, а ягоны сын Багуслаў служыў у беларускай навучальнай акрузе ў сціплым чыне калежскага рэгістратара. Бандзкевічы атрымалі пацверджанне свайго дваранскага статуса ў 1847 г., і на пачатку 50-х гг. XIX ст. Марцін быў губернскім сакратаром, а Рыхард служыў у штаце Вілейскага ўезднага суда (чын невядомы) [8, л. 2]. Яшчэ адні Васілеўскія, што праходзілі па спісах дваран Мазырскага павета, нягледзячы на тое, што даказалі свае шляхецкае паходжанне ў Герольдыі толькі ў 1865 г., служылі на выбарных дваранскіх пасадах. У 1816 г. Вікенцій і Нарберт Васілеўскія служылі межавымі суддзямі аднайменнага павета [9, с. 4]. Дарэчы, іх выпадак выдатна ілюструе двухступенны працэс прызнання прадстаўнікоў беларускай шляхты ў расійскім дваранстве. На мясцовым, губернскім, узроўні гэтыя Васілеўскія прызнаваліся дваранамі неаднаразова. Самае ранняе рашэнне губернскага дэпутацкага сходу адносіцца аж да 1802 г., пасля чаго двойчы, у 1835 і 1848 гг. дваранскі дэпутацкі сход Мінскай губерні выносіў гэтакія ж рашэнні. Аднак у цэнтральных органах улады палічылі інакш: паколькі дакументы ў Герольдыю гэтым шляхецкім родам былі прадстаўлены не ў арыгінале, то Васілеўскім ў пацверджанні дваранства было адмоўлена [9, с. 13]. З іншага боку, ў спісах дваран Мінскай губерні Васілеўскія праходзілі па шостай частцы (старажытнае дваранства). Цікава, але ў крымінальнай справе «о причинении побоев помещиком Казимиром Василевским крестьянке Довнаровой и о ранении ребенка крестьянкой того ж Василевского» першы адназначна названы «помещиком» [9, с.45]. Нарэшце, прызнанне гэтай шляхецкай фаміліі ў расійскім дваранстве ўказам Герольдыі ад 30 ліпеня 1865 г. суправаджалася перанясеннем з шостай у першую частку радаслоўнай кнігі. З гэтага рашэння вынікае, што ўлады прызналі дваранства не за родам Васілеўскіх увогуле, але толькі за сучаснымі яго прадстаўнікамі [9, с. 115–116].

Яшчэ адзін шляхецкі род з гэтым распаўсюджаным прозвішчам, які даказваў свае паходжанне ў Віцебскім дваранскім дэпутацкім сходзе, прайшоў падобны ж шлях. Станіслаў Васілеўскі ў 1806 г. быў абраны на пасаду пяцідесяцкага начальніка земскай міліцыі Себежскага павета. За час службы ён зарэкамендаваў сябе як добранадзейны дваранін, нават атрымаў «всемилостивейше пожалованную» залатую шпагу. Пры пацверджанні свайго шляхецкага паходжання Васілеўскі прадставіў прывілей Яна III Сабескага 1677 г. аб узвядзенні свайго продка Мікалая Васілеўскага на пасаду вознага Віцебскага ваяводства. Дакумент пацвярджаў адначасова валоданне гэтым родам маёнткам Царабабыль аж да 1769 г. Яўленыя былі таксама царкоўныя метрыкі, рэскрыпт галоўнакамандуючага князя Галіцына аб добранадзейнасці і шмат іншых даведак і сведчанняў шляхецкага паходжання. Да таго ж Станіслаў Васілеўскі праходзіў па дваранскіх спісах Полацкага павета 1816 г. [10, с. 231]. Неабходныя дакументы былі афармлены не на гербавай паперы, а на звычайнай, што сведчыла пра незаможнасць гэтага роду. Але карыстацца простай паперай яшчэ ў 1808 г. было дазволена тым, хто не меў адпаведных сродкаў. Такім чынам, у гэтым выпадку саслоўна-службовы статус відавочна не адпавядаў маёмаснаму [5, с. 30].

У цэлым складаны і заблытаны працэс праверкі шляхецкага паходжання асоб спарадзіў, акрамя праяў звычайнай для Расійскай імперыі бюракратычнай валакіты, таксама і шмат злоўжыванняў на месцах. Праявіліся яны і пад час павятовых дваранскіх выбараў. Так, за незаконную выдачу некаторым асобам пасведчанняў аб дваранстве да суда былі прыцягнуты выбраныя на пасады ў дваранскім самакіраванні Віленскай губерні віцэ-маршалак Сальмановіч, старшыні судоў Тур і Кушалеўскі, а таксама Іосіф Квінта і Вікенцій Загорскі [11, л. 3]. У 1802 г. у лісце да дваранскага сходу Віленскай губерні цывільны губернатар адзначаў: «Приступая к утверждению дворянских выборов в каждом повете, особо произведённых, не могу я утвердить выборов Завилейского, Браславского и Шавельского поветов по причине учиненных многими дворянами манифестов, поступивших ко мне жалоб, что те выборы учинены ненадлежащим образом, что изданные о выборах узаконения нарушены, что некоторые особы, собрав сильные партии, в обиду прочих поступали самовольно» [12, л. 132]. Падобнае адбылося ў 1808 г. на выбарах у Віленскім павеце. Павятовага прадвадзіцеля дваранства Забелу выклікалі на губернскія выбары, а ў гэты час яго намеснікі правялі на павятовыя пасады асоб, якія не мелі права іх займаць. Такім незаконным шляхам на пасады суддзяў Віленскага земскага суда былі абраны Тамаш Тышкевіч, Антоній Пражэўлоцкі і Леапольд Віннік. Земскім іспраўнікам стаў

Каспер Свехоўскі, а засядацелем у ніжнім земскім судзе – Семіятовіч [13, л. 174]. Дакумент сведчыць аб тым, што парушэнні на выбарах былі звычайнай з'явай, што некаторых асоб фактычна не дапускалі да ўдзелу ў іх, і, самае галоўнае – яны паказалі, наколькі жывучымі былі старыя соймавыя традыцыі, калі больш уплывовыя асобы гуртавалі вакол сябе мясцовую шляхту і з яе дапамогай праводзілі патрэбныя ім рашэнні.

Цікавыя факты, якія датычацца злоўжываннеў службовых асоб, прыводзілі археографы XIX ст. У апісанні Віленскага архіва І. Я. Спрогіс задаваўся пытаннем, адкуль у заходніх губернях Расійскай імперыі такая вялікая колькасць асоб шляхецкай годнасці? Паводле падлікаў даследчыка, адносіны паміж колькасцю дваран у гэтых губернях у параўнанні з унутранымі складалі як мінімум 20:1 [2, с. 6]. Гэтак сталася з відавочнай прычыны: належаць да прывілеяванага саслоўя было выгадна з эканамічных, сацыяльных і іншых бакоў. І. Я. Спрогіс прытрымліваўся думкі, што такая колькасць дваран у заходніх губернях расійскай імперыі з'явілася толькі дзякуючы падробленым дакументам, а іх колькасць толькі ў Віленскім архіве дасягае 60 тысяч: «В то время, как в старину по свидетельству тех же актовых книг «вывод», или утверждение, в дворянстве был соединен с большими затруднениями... в новейшее время нужно доказать лишь, что прадед, дед и отец истца владели имением, населенным крестьянами, а для этого достаточно было предъявить три каких-нибудь крепостных древних документа... И такие документы подделывались. И по этим поддельным документам прошла вся поражающая нас масса новых искателей дворянства» [2, с. 7]. П. Гільдтэбрандт нават прыводзіць абсалютную колькасць асоб, якія належалі да дваранскага саслоўя. Так, паводле дадзеных на 1844 г., у Віленскай губерні было запісана 51 078 дваран абодвух палоў, у Віцебскай – 25 530, у Гродзенскай – 37 019, Мінскай – 54 575, Магілёўскай – 32 424 [3, с. XXVII]. Агульная колькасць дваран па пяці беларускіх губернях складала, такім чынам, 200 626 чалавек, што амаль дасягала колькасці дваран ва ўнутраных расійскіх губернях. Усяго ж у дзевяці заходніх губернях (у адзначаных, а таксама Ковенскай, Кіеўскай, Падольскай і Валынскай) да дваранскага саслоўя належала 377 626 чалавек, якія складалі 3,56% губернскага насельніцтва. Разам яны аж на 145 000 чалавек пераўзыходзілі колькасць дваран ва ўнутраных расійскіх губернях, дзе вышэйшае саслоўе складала толькі 0,48% ад насельніцтва [тамсама]. Відавочна, што ўлады валодалі інфармацыяй аб фактах падробкі дакументаў на дваранства, паколькі 19 снежня 1833 г. выйшаў імператарскі ўказ, што прадугледжваў стварэнне спецыяльных камісій, якія павінны былі «для предупреждения дальнейших подлогов в метрических и актовых книгах прошедшего времени оные скрепить и, перечертя пробелы, прошнуровать и запечатать» [14, № 6644]. Унясенне асоб у актавыя кнігі і падробка неабходных дакументаў каштавала ў 30–50-я гг. XIX ст. 50 рублёў [2, ст. 8].

Што датычыцца дзяржаўнай службы, то шляхта беларускіх зямель у цэлым не апраўдала спадзяванні ўраду, паколькі мясцовыя шляхцічы са значна большым жаданнем займалі менавіта выбарныя дваранскія пасады. Гэта, безумоўна, стрымлівала інтэграцыю шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі, паколькі служба ў якасці чыноўніка давала добрую магчымасць кар'ернага росту і атрымання чыноў і узнагарод, якія адчынялі ім браму Герольдыі. Цікава, што ў карэнных расійскіх губернях усё было наадварот. Там на пачатак XIX ст. склалася парадаксальная сітуацыя: нават захады ўраду па замяшчэнні незанятых выбарных пасад прызначаемымі чыноўнікамі і ўраўнанні чыноў дзяржаўнай і выбарнай службы не дасягнулі поспеху [5, с. 34]. Адваротную сітуацыю ў беларускіх губернях Сяргей Аляксандравіч барон Корф тлумачыў у свой час проста–больш высокім культурным узроўнем мясцовай шляхты, лепшай адукацыяй, большай карпаратыўнасцю [1, с. 67]. Так, мясцовыя прадвадзіцелі дваранства пры сусрэчах імператара Аляксандра І трымаліся з гонарам, а прадвадзіцелі ў расійскіх губернях больш нагадвалі афіцыянтаў, паколькі баяліся прамовіць слова [тамсама]. На наш погляд, адзначаныя «перажыткі» з часоў Рэчы Паспалітай скіроўвалі нетытулаваную шляхту да ўдзелу ў дваранскіх выбарах, паколькі атрыманыя пасады таксама дэ-факта станавіліся шляхам для ўваходжання ў дваранства Расійскай імперыі. Сучаснымі даследчыкамі была зроблена выснова, што для незаможнай нетытулаванай шляхты выбарныя пасады (асабліва ў судовых органах) рабіліся пэўнай крыніцай узбагачэння. Так, паводле выбараў 1785 г. у Полацкім, Віцебскім, Дрысенскім, Суражскім і Гарадоцкім паветах з 20 засядацеляў павятовых і ніжніх земскіх судоў 11 чалавек мелі ў сярэднім да 30 душ прыгонных [4, с. 55].

Змены ў палітыцы адносна шляхты пасля паўстання 1830–1831 гг. прывялі да змен у парадку правядзення дваранскіх выбараў у заходніх губернях. Незадаволенасць царскай адміністрацыі нежаданнем мясцовай шляхты служыць на цывільнай і вайсковай службе вылілася ў кастрычніку 1835 г. у спецыяльнае распараджэнне аб выбарах ў заходніх губернях. Паколькі асноўная маса выбарных пасад займалася асобамі, якія або не служылі ўвогуле,

або служылі кароткі тэрмін, распараджэннем у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Валынскай, Падольскай губернях і Беластокскай вобласці прадугледжвалася забарона на абранне тых, хто праслужыў дзяржаве менш за 10 год, а на вакантныя месцы прызначаць чыноўнікаў паводле распараджэння міністра ўнутраных спраў. Адзінае выключэнне было зроблена для асоб, якія праслужылі два трохгадовыя тэрміны па выбарах. Яшчэ раней, у 1831 г., было прынята «Палажэнне аб выбырах і сходах». Гэтым дакументам уводзіўся маёмасны цэнз на ўдзел у выбарах. Голас мелі тыя дваране, якія валодалі не менш чым 100 душ прыгонных або больш чым 3 тысячы дзесяцін зямлі. Самае цікавае, што тыя шляхцічы, які не дасягалі цэнзу, дэлегіравалі на дваранскія выбары ўпаўнаважаных. Маёмасць незаможных шляхецкіх фамілій суміравалася да патрабуемай цэнзам колькасці. Гэта, відавочна, нагадвала старыя традыцыі выбару паслоў, але на сойм з адной агаворкай–калі ў часы існавання Рэчы Паспалітай мясцовы сход вызначаў дэлегатаў з агульнадзяржаўнымі паўнамоцтвамі, то цяпер мясцовая шляхецкая карпарацыя выбірала прадстаўнікоў на губернскі узровень. Каб зразумець, наколькі вялікім быў цэнз, трэба адзначыць, што такой вялікай колькасцю прыгонных нетытулаванная шляхта ў сваёй большасці не валодала. Так, у Лідскім павеце адным з нешматлікіх выключэнняў па выбарнаму цэнзу былі Рассудоўскія. Ім належала 310 рэвізскіх душ прыгонных [15, л. 9–10].

Па сведчаннях сучаснікаў, да сярэдзіны XIX ст. інтэграцыя нетытулаванай шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі адбывалася таксама дастаткова паспяхова і на бытавым ўзроўні, прычым галоўным фактарам тут выступала працягласць знаходжання шляхты той ці іншай беларускай губерні ў расійскім падданстве. Напярэдадні другога падзелу Рэчы Паспалітай стаўленне да мясцовай шляхты было яшчэ адназначна недаверлівым. Так, у лісце да князя Сяргея Фёдаравіча Галіцына ў 1791 г. князь Мікалай Васільевіч Рапнін пісаў: «Податель сего господин Василевский, коморник пограничной Любельский, имеет дело до майора Тоуберта, которого я с подорожной до Берлада к вашему Сиятельству отправляю. Лучше, однако ж, по сему партикулярному делу, дабы сей поляк, которого впрочем надлежит ласково принять, по нашим постам и квартирам не шатался, а по окончании их дела дайте ему, Василевскому, обратную подорожную, куда он только пожелает: суда ли только или же в Могилёв» [16, с. 268]. Аднак праз некалькі дзесяцігоддзяў сітуацыя змянілася. У сваіх «Путевых заметках на поездке из Дерпта в Белоруссию и обратно весною 1835 года» Фадзей Булгарын адзначаў: «В витебском дворянстве много заслуженных людей, украшенных знаками отличия: русский язык здесь чрезвычайно распространен. По-польски говорят только в семье. Все дамы также говорят прекрасно по-русски. В Литве еще много не знающих вовсе русского языка» [17, с. 210]. Прысутнасць ва ўсходняй Беларусі этнічна рускіх дваран і чыноўнікаў таксама спрыяла, як бачна, пранікненню ў паўсядзённы побыт мясцовай шляхты агульнарасійскіх асаблівасцяў. Пра гэта Ф. Булгарын пісаў, што дзякуючы падараванням зямельных уладанняў рускім тытулаваным фаміліям у Магілёўскай губерні «здесь русский тон хорошего общества и образ жизни полурусский и полупольский. Русский язык во всеобщем употреблении» [17, с. 216]. Гэта таксама пацвярджаецца лістамі, напісанымі Бенедзіктам Завадскім да ўпраўляючага справамі маёнткаў графа Тышкевіча Канстанціна Ральцэвіча. Цікава, што, пачынаючы з другой паловы 50-х гг. XIX ст., мова ягоных лістоў змяняецца з польскай на рускую. У верасні 1854 г. Завадскі пісаў папольску, што «доўга не мог адпісаць адказ па прычыне, што я быў у дарозе і не меў часу бо сапраўды кожны дзень хадзілі мы на муштру...» [18, л. 79]. Аднак ужо ў красавіку 1859 г. Бенедзікт Завадскі пісаў Канстанціну Ральцэвічу з месца сваёй службы па-руску: «Любезный брат, писал ты в своем письме, чтобы я тебя известил о своей службе и также, получу ли я офицерский чин. Не хочу я перед тобою врать, потому что мне будет грешно перед господом Богом..., а опишу тебе истинную правду, что служба идет хорошо, а офицерского чина надо еще подождать, потому что в нашем полку совершенно нет никакой вакансии» [18, л. 196–197]. Змену мовы зносін з блізкімі асобамі можна патлумачыць новым культурным асяроддзем, куды трапіў аўтар згаданых пасланняў, што сведчыць пра дастаткова высокую ступень адкрытасці нашай шляхты да ўнутрысаслоўнай інтэграцыі.

**Заключэнне.** Арыентуючыся на арыстакратыю, нетытулаваная шляхта ў цэлым паспяхова інтэгравалася ў расійскае дваранства. Стрымлівала яе замаруджванне канчатковага прызнання дваранскага статусу і традыцыйны кансерватызм шляхты, з яе вядомым «залатым» прынцыпам «nihil novi», які перашкаджаў перадолець архаічную карпаратыўнасць. Першыя дзесяцігоддзі знаходжання ў расійскім падданстве праявілася жывучасць старых соймавых традыцый. Новыя расійскія парадкі выкарыстоўваліся ў сваіх карпаратыўных інтарэсах. Так, агульнаімперская сістэма дваранскіх выбараў шляхтай беларускіх зямель была ўспрынята як нейкі новы варыянт выбарнай

соймавай сістэмы, што існавала ў скасаванай Рэчы Паспалітай. Высвятляюцца нават факты стварэння, – на павятовым узроўні, – нечага накшталт шляхецкіх міні-, ці мікракарпарацый, што дазваляе зрабіць выснову аб тым, што сістэма дваранскіх выбараў была прыстасавана да старой соймавай сістэмы. Нарэшце, прысутнасць сярод мясцовай шляхты рускіх дваран адкрывала шлях да інтэграцыі на бытавым ўзроўні, якая ў асноўным праходзіла паспяхова.

### Літаратура


1. Корф, С. А. Дворянство и его сословное управление за столетие (1762 – 1855 гг.) / С. А. Корф. – СПб., 1906.
2. Спрогис, И. Я. Виленский центральный архив древних актовых книг. / И. Я. Спрогис. – Вильна, 1901.– 8 с.
3. Гильтебрандт, П. Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки. Вып. 1 / П. Гильдебрандт. – Вильна, 1871. – XXVI+184 с.
4. Анішчанка, Я. Дваранскія выбары ў Полацкім намесніцтве 1789 г. // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. № 3–4. 1992.
5. Луговцова, С. Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII–первой половине XIX века / С. Л. Луговцова. – Мн.: БГПУ им. М.Танка, 1997. – 78 с.
6. НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 393.
7. НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 1686.
8. LVIA. Ф. 391, воп. 8, спр. 476.
9. НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 441.
10. НГАБ. Ф.2152, воп. 1, спр. 233.
11. LVIA. Ф. 391, воп. 2, спр. 78.
12. LVIA. Ф. 391, воп. 2, спр. 9.
13. LVIA. Ф. 391, воп. 2, спр. 12.
14. ПСЗ I. Т.8, 1834.
15. LVIA. Ф. 391, воп. 5, спр. 561.
16. Энгель, А. Описание дел, хранящихся в архиве Виленского генерал-губернаторства. Т. 1. Ч. 1–2 (1783–1791) / А. Энгель – Вильна, 1869. VI+984 с.
17. Булгарын Ф. Выбранае / Уклад., прадм., камент. А. Фядуты. – Мінск: Беларускі кніга-збор, 2003. – 592 с. (8) с.
18. LVIA. Ф. 716, воп. 1, спр. 65.